ДУ “ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА імя У. І. ЛЕНІНА”

АДДЗЕЛ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Анатоль Мікалаевіч КАНАПЕЛЬКА



Віцебск, 2009

ДУ “ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У.І. ЛЕНІНА”
АДДЗЕЛ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

АНАТОЛЬ МІКАЛАЕВІЧ

КАНАПЕЛЬКА

Біябібліяграфічны паказальнік

Віцебск, 2009

УДК 016:882.6(092)
ББК 91.9 :83.3(4Беи- 4Вит)6-8
К19

Складальнік С.У. Заянкоўская
Рэдакцыйная калегія: Т.М. Адамян (адказны рэдактар), В.М. Аўсяннікава
Адказны за выпуск А.І. Сёмкін

Анатоль Мікалаевіч Канапелька: біябібліяграфічны паказальнік / ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна”, аддзел беларускай літаратуры; [склад. С.У. Заянкоўская].- Віцебск, 2009. – 51 с.

У біябібліяграфічны паказальнік “Анатоль Мікалаевіч Канапелька” ўключаны бібліяграфічныя запісы на мастацкія, навуковыя і навукова-метадычныя творы вядомага віцебскага паэта, грамадскага дзеяча, публікацыі аб яго жыцці і творчасці, а таксама бібліяграфічная даведка Вольгі Русілкі і ўступны артыкул Уладзіміра Папковіча.

Выданне прызначана навукоўцам і практыкам у галіне філолага-педагагічных дысцыплін, выкладчыкам, студэнтам, аспірантам, супрацоўнікам бібліятэк і ўсім, хто цікавіцца сучаснай беларускай паэзіяй.

© ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна”

Анатоль Мікалаевіч Канапелька нарадзіўся 16 лістапада 1939 года ў Расонах. Скончыў з адзнакаю філалагічны факультэт Магілёўскага педінстытута.

Член Саюза беларускіх пісьменнікаў. Паэт, перакладчык, літаратуразнавец.

Вершы пісаць пачаў яшчэ школьнікам. У друку яны ўпершыню з'явіліся ў 1955 годзе – у полацкай газеце "Сцяг камунізму", у абласной газеце "Віцебскі рабочы", у 1958 годзе – на старонках альманаха "Дзвіна".Потым вершы Анатоля Канапелькі друкаваліся ў часопісах "Полымя", "Маладосць", "Беларусь", "Работніца і сялянка", "Бярозка", рэспубліканскіх газетах "Літаратура і мастацтва", "Звязда", "Чырвоная змена", "Знамя юности", "Настаўніцкая газета", у абласной газеце "Народнае слова", іншых вядомых выданнях.

Аўтар зборнікаў вершаў "Зямная сімфонія" (1966), "Сустрэчы" (1979), "Музыка лістапада" (1999), а таксама шматлікіх навуковых прац і артыкулаў пра Яна Баршчэўскага і Петруся Броўку, Васіля Быкава і Рыгора Барадуліна, Уладзіміра Караткевіча і Уладзіміра Арлова, іншых слынных літаратараў.

Анатолем Канапелькам перакладзены на беларускую мову вершы расійскіх паэтаў М. Рыленкава, А. Мішына, Ю. Пашкова, У. Прастакова, з польскай мовы – творы Я. Баршчэўскага, Т. Лады-Заблоцкага, з цыганскай – В. Калініна.

У рэпертуары Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я.Коласа ёсць спектакль "Руслан і Людміла", для якога вершы А.Пушкіна пераклаў Анатоль Канапелька. Яго пяру і таленту належыць таксама пераклад п'есы А.Астроўскага "Праўда добра, а шчасце - лепш", таксама зроблены для коласаўцаў.

Некалькі гадоў запар Анатоль Мікалаевіч вёў на старонках "Народнага слова" рубрыку "Анталогія беларускай паэзіі". З чытацкіх пісьмаў і водгукаў вядома, што гэтыя публікацыі спатрэбіліся ў працы многім настаўнікам, краязнаўцам, для вучобы – школьнікам, студэнтам, для душы – аматарам прыгожага пісьменства. Было апублікавана каля паўсотні артыкулаў.

Творы паэта перакладаліся на рускую, украінскую і іншыя мовы. Яны ад шчодрагасэрца адрасаваны ўсім, хто любіць родную зямлю, яе людзей, прыроду. Яны такія, як і іх аўтар – таленавіты, прыгожы і светлы чалавек.

Памёр Анатоль Канапелька 18 снежня 2002 года. Пахаваны ў Віцебску.

Вольга Русілка

АД СКЛАДАЛЬНІКА

Дадзены біябібліяграфічны паказальнік прысвечаны жыццю і творчасці паэта, перакладчыка, літаратуразнаўцы, члена Саюза беларускіх пісьменнікаў, дацэнта кафедры беларускай літаратуры УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, выдатніка адукацыі Рэспублікі Беларусь, лаўрэата Віцебскай гарадской прэміі “Сузор’е муз”, лаўрэата абласной прэміі імя Уладзіміра Караткевіча Анатоля Мікалаевіча Канапелькі і прымеркаваны да 70-годдзя з дня яго нараджэння.

Паказальнік складаецца з дзвюх частак. У першай частцы прадстаўлены ўступны артыкул Уладзіміра Папковіча, біяграфічная даведка і бібліяграфічныя запісы ў наступным парадку: кнігі, мастацкія творы, апублікаваныя ў зборніках і перыядычных выданнях, пераклады, літаратуразнаўчыя артыкулы.

У другую частку паказальніка ўвайшлі публікацыі аб жыцці і творчасці Анатоля Мікалаевіча Канапелькі.

Матэрыялы размешчаны ў храналагічным парадку і ахопліваюць перыяд з 1957 года па 2009 год.

Выданне суправаджаецца алфавітным паказальнікам літаратурных твораў, апублікаваных у зборніках і перыядычных выданнях.

Пры складанні паказальніка выкарыстаны: “Летапіс друку БССР”, “Летапіс друку Беларусі”, каталогі, картатэкі Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна, а таксама матэрыялы з асабістага архіва, якія прадаставіла жонка паэта Святлана Іванаўна Федаровіч.

Біябібліяграфічны паказальнік можа быць рэкамендаваны навукоўцам і практыкам у галіне філалагічных дысцыплін, выкладчыкам, студэнтам, аспірантам, супрацоўнікам бібліятэк і ўсім тым, хто цікавіцца сучаснай беларускай паэзіяй.

СВЕТЛЫ ЧАЛАВЕК

Бывае, сустрэнеш чалавека, глянеш на яго твар і паставу, ды пачуеш яго манеру выказвацца, і падумаеш: “Светлы чалавек.” У нас дома, яшчэ да Саветаў, пры Польшчы, гаварылі: “Які шляхетны чалавек!” Гэта ўбірала ў сябе тое, што па-расейску азначае “интеллигент” у самым шырокім значэнні гэтага слова. Пад гэта падрабіцца цяжка.

Такім быў Анатоль Мікалаевіч Канапелька, якога я рэдка называў проста Толем, бо стаўленне да яго не дазваляла панібрацтва.

Я памятаю, што мы пазнаёміліся ў пачатку 70-ых на факультэце пачатковых класаў (афіцыйная назва факультэта занадта складаная для мяне), дзе мы абодва працавалі. Я, яшчэ амаль ні з кім незнаёмы ў гэтым горадзе, шукаў людзей, блізкіх да літаратуры. У Анатоля Мікалаевіча, здаецца, ужо была яго першая кніжка “Зямная сімфонія”. Гэта значыла ў той час вельмі шмат, не тое, што цяпер, дзе кожны графаман можа выдаць сваю кніжку (а хоць і шматтомнік) за грошы і будзе раздаваць сябрам і горда называць сябе паэтам.

З Анатолем Мікалаевічам мы выдавалі ў той час інстытуцкую насценгазету, дзе збіраліся найбольш таленавітыя студэнты – паэты і мастакі. На гэтай аснове і быў потым створаны літгурток “Зараначка” і насценгазета пад такой жа самай назвай. У тым гуртку студэнты разам з намі не толькі чыталі і абмяркоўвалі свае вершы, але выступалі з аглядам свежых часопісаў “Беларусь”, “Маладосць”, “Полымя”, а таксама рыхтавалі рэфераты і даклады пра творчасць асобных пісьменнікаў і паэтаў, асабліва тады маладых яшчэ, але ўжо шырока вядомых Уладзіміра Караткевіча, Міхася Стральцова, Рыгора Барадуліна, Генадзя Бураўкіна і інш.

Бліжэй пазнаёміліся мы з Анатолем Мікалаевічам у 80-я гады мінулага стагоддзя, пасля майго даволі працяглага перапынку працы спачатку ў інстытуце, які ўжо пазней стаў універсітэтам імя П.М. Машэрава.

З гэтага часу, асабліва ў перыяд актыўнага нацыянальнага Адраджэння канца 80-ых—пачатку 90-ых гадоў мы бывалі вельмі часта разам: на сходах Саюза пісьменнікаў, паседжаннях Таварыства беларускай мовы, мы рабілі сумесныя тэлеперадачы “Кніга выйшла ў свет”, дзе прапагандавалі новыя творы нашых землякоў, выступалі разам у розных аўдыторыях. Прафесійная і чалавечая апантанасць Анатоля Канапелькі як выкладчыка беларускай літаратуры заўсёды прыемна здзіўляла мяне. Амаль пры кожнай сустрэчы ён пытаўся, ці чытаў я новую аповесць Васіля Быкава, вершы Рыгора Барадуліна, ці, напрыклад, толькі што выдадзеную кніжку Уладзіміра Караткевіча “Быў. Ёсць.Буду.” Ён любіў нашых самых адметных пісьменнікаў і паэтаў, ён захапляўся імі ўсімі сэрцам і душой і перадаваў гэтае пачуццё захаплення сваім студэнтам. Прысвячэнні ў яго зборніках вершаў гавораць пра тое, хто яму быў блізкі на гэтай зямлі.

Яго ж любілі і паважалі тыя, з кім ён кантактаваў ці вучыў ва ўніверсітэце.

У які раён, бывала, не прыедзеш, у любой аўдыторыі, ды і ў прыватных размовах, абавязкова, знойдзецца хтосьці, хто спытае: “А як там Анатоль Мікалаевіч?”

Яго вершы, прысвечаныя Каханай, вельмі цнатлівыя, тут не знойдзеш неахайнасці ці пошасці. Ён пісаў пра свае пачуцці так, каб потым не сорамна было перад сваімі студэнтамі ці аўдыторыяй, перад якой выступаў. Гумар яго вельмі тонкі, не крыўдны.

Я прысягаю
іменем тваім,
тваёю вернасцю,
тваёй любоўю.
... Над намі вечар,
мройны снежны дым,
І мы ўдваіх
на ўсёй зямлі з табою.

Альбо: Там,

ля арэшнікаў грэшных,

словы знайду для душы.

Пойдзем са мной па арэхі

Шукаць спарышы!

Ці не цудоўна?

Ён пісаў, хоць і не шмат, але вельмі старанна працуючы над словам. Ён любіў тэатр і музыку, і яго ўласныя вершы гучаць, як музыка. Пра яго асаблівыя адносіны з трупай тэатра імя Якуба Коласа, я думаю, напішуць самі акцёры. У яго было шмат сяброў сярод журналістаў, мастакоў, музыкаў, проста работнікаў культуры.

Цяпер ужо не ведаю, з якой нагоды я напісаў верш, які нядаўна знайшоў у сваіх паперах, магчыма, да нейкага юбілею, а, можа, проста так, каб выказаць свае сяброўскія пачуцці.

* * *

Анатолю Канапельку

Калі зусім зняможаны ад спраў

прыпынішся,

нядобрай сілай скуты,

прыслухайся, як у душы зайграў

арган чароўны,

анікім не чуты.

Ты ў паднябессе глянеш з-пад рукі:

Адкуль такая музыка ліецца?

Бы жаўрукі,

чароўныя радкі,

увысь пад неба

вылятаюць з сэрца.

І вольны вецер іх ва ўсе бакі нясе,

а ты стаіш, ад шчасця анямелы

і слухаеш, як за табой усе

спяваюць аб святым і набалелым.

Анатоль Канапелька, мой сябра Толя, у адным са сваіх вершаў, у адчаі ўсклікнуў:

О, як рана,

О, як вельмі рана

мы губляем

назаўжды

сяброў.

Колькі разоў за жыццё нам даводзіцца паўтараць гэтыя простыя словы, толькі з маленькай папраўкай (няхай мне Толя даруе): сябры застаюцца ў нашай памяці...

Уладзімір Папковіч

КНІГІ

1. **Зямная** сімфонія : вершы / А.М. Канапелька. - Мн. : Беларусь, 1966. - 55 с.
2. **Сустрэчы** : вершы / А.М. Канапелька. – Мн. : Маст. літ., 1979. – 72 с.
3. **Музыка** лістапада : лірыка / А.М. Канапелька. – Віцебск : Віцебская абл. друк., 1999. – 96 с.

МАСТАЦКІЯ ТВОРЫ, АПУБЛІКАВАНЫЯ Ў ЗБОРНІКАХ І ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯХ

1957 год

4. **Сустрэча** : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1957. – 28 ліст. - С. 3.
5. **Якубу** Коласу. Георгій Скарына : [вершы] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1957. – 3 лют. – С. 3.
6. **Неназванае** : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1957. – 24 жн. – С. 3.
7. **Камень** : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1957. – 23 кастр. – С. 3.

1958 год

8. **Якубу** Коласу. Ружа : [верш] / А.М. Канапелька // Дзвіна : літаратурна–мастацкі альманах. – Віцебск : Літ. аб'яднанне пры рэдакцыі газеты "Віцебскі рабочы", 1958. – С. 107.
9. **Галінка** : [верш] / А.М. Канапелька // Літаратура і мастацтва. – 1958. – 2 крас. – С. 3.
10. **Ружа** : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1958. – 27 крас. – С. 3.
11. **На канікулах** : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1958. – 15 чэрв. – С. 3.

1959 год

12. **Балада** пра Маноліса Глезаса : [верш] / А.М. Канапелька // Літаратура і мастацтва. – 1959. – 28 лют. – С. 4.
13. **Сэрцы** : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1959. – 22 сак. – С. 3.
14. **Прывал** : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1959. – 17 мая. – С. 3.

1960 год

15. **Бор** : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1960. – 7 лют. – С. 3.
16. **Закалыхаўся** бор стары… : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1960. – 6 крас.
17. **Слова** пра салдата : [верш] / А.М. Канапелька // Літаратура і мастацтва. – 1960. – 16 крас. – С. 3.
18. **Паслухай**, зямля…: [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1960. – 9 мая. – С. 2.
19. **Роздум** : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1960. – 26 чэрв. – С. 1.
20. **У Брэсцкай** крэпасці : [вершы] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1960. – 14 верас. – С. 2. – Змест: У музеі. Ля помніка невядомаму салдату. Ля камсамольскага білета Аляксея Наганава.
21. **Рэха** : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1960. – 27 ліст. – С. 2.

1961 год

22. **Імёны** : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1961. – 7 чэрв. – С. 3.
23. **Мы нарадзіліся такімі**…: [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1961. – 22 чэрв. – С. 2.

24. **Я нарадзіўся** пад шчаслівым небам : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1961. – 27 жн. – С. 3.

25. **Шумяць** дажджы…: [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1961. – 26 ліст. – С. 3.

1962 год

26. **Мы** нарадзіліся такімі. Мова. Рэха : [вершы] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1962. – 3 студз.

27. **"Звініць!** Струна-прамень. Я слухаю…" : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1962. – 11 студз. – С. 3.

28. **У паходзе** : [вершы] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1962. – 13 лют. – С. 3. – Змест: "Мы прывыклі да шляхоў далёкіх…". "І зноў стаю я над Дзвіною…".

29. **Вясновае** : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1962. – 28 крас.

30. **Вясновае** : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1962. – 6 мая. – С. 3.

31. **Раніца** : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1962. – 11 мая.

32. **"Я сёння** чую…" : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1962. – 22 мая.

33. **"Ты** не знойдзеш і ценю зайздрасці…" : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1962. – 27 мая. – С. 1.

34. **Першамайская** вуліца : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1962. – 29 мая.

35. **Прайшла цішыня** : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1962. – 14 чэрв. – С. 4.

36. **Зямная** сімфонія : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1962. – 16 чэрв. – С. 4.

37. **Мы** нарадзіліся такімі. Вяселка : [вершы] / А.М. Канапелька // Маладосць. – 1962. - № 6. – С. 86-87.

38. **У дарогу** : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1962. – 8 жн. – С. 3.

39. **Я слаўлю!** : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1962. – 15 жн. – С. 1.

40. **Я слаўлю!** : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1962. – 15 жн.

41. **Мой** дар : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1962. – 24 жн.

42. **З вершаў** на конкурс : [вершы] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1962. – 15 верас. – С. 3. – Змест: Першамайская вуліца. Адспявала лета. Мой дар. "Я сёння чую пазыўныя Марса…".

43. **Зямная** сімфонія : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1962. – 21 верас.

44. **У кожным** кутку : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1962. – 3 ліст.

45. **Дарогі** клікалі не раз : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1962. – 7 ліст.

46. **Размова** з Якубам Коласам : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1962. – 2 снеж.

47. **Перад** зменаю : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1962. – 7 снеж. – С. 2.

48. **Вершы** : [вершы] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1962. – 18 снеж. – Змест: "Наш дзень…". "Я чую як зямля вібрыруе…". "Маё сэрца цяпер трывожыць…".

1963 год

49. **Дарогі** клікалі не раз…: [верш прысвечаны Аляксею Пысіну] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1963. – 13 студз. – С. 3.

50. **А маці** трэба берагчы…: [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1963. – 5 лют. – С. 2.

51. **Я** галасую : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1963. – 3 сак.

52. **А маці** трэба берагчы…: [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1963. – 16 крас.

53. **“Тут** сцежкі перамераны…” : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1963. – 5 мая. – С. 3.

54. **Дзяўчаты** слухаюць вершы : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1963. – 18 мая.

55. **Высякаюць** маланкі іскры : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1963. – 29 мая. – С. 3.

56. **Сэрца** набатам гучыць… : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1963. – 27 чэрв. – С. 4.

57. **Сэрца** набатам гучыць… : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1963. – 28 чэрв.

58. **Ля плёсаў** дняпроўскіх : [верш] / А.М. Канапелька // Бярозка. – 1963. - № 6. – С. 4.

59. **Вятры** Расіі : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1963. – 4 жн.

60. **А дні** як ракеты… : [верш] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 17 жн. – С. 3.

61. **Роднае**. Вятры Расіі. Дзяўчаты слухаюць вершы. Сяброўцы. Ноч у Брэсцкай крэпасці : [вершы] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1963. – 20 жн. – С. 3.

62. **Партыі** : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1963. – 24 верас.

63. **Пад ветрам**… Шышкі. “І толькі сталасць…” : [вершы] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1963. – 3 ліст.

64. **“Ідуць** нашчадкі рэвалюцыі…” : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1963. – 6 ліст.

65. **Партыі** : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1963. – 12 снеж. – С. 1.

66. **Пад ветрам**… : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1963. – 29 снеж. – С. 4.

1964

67. **Людзі** – не эталоны (вельмі ж розныя людзі)…”. “Ах, падабаюцца, падабаюцца…” : [вершы] / А.М. Канапелька // Магілеўская параўда. – 1964. – 28 лют.

68. **“Людзі** – не эталоны (вельмі ж розныя людзі)…”: [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1964. – 22 сак. – С. 2.

69. **Не хавайце** сваіх усмешак…: [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1964. – 29 сак.

70. **Партыі.** “Ты – як песенька, ты – як сонейка…”. Не хавайце сваіх усмешак…: [вершы] / А.М. Канапелька // Настаўніцкая газета. – 1964. – 17 чэрв. – С. 4.

71. **Дзе плешчацца** Дняпро…: [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1964. – 19 ліп.

72. **Зямная** сімфонія. Ты – мая песня : [вершы] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1964. – 26 ліп. – С. 3.

73. **Роднае.** “Я сутнасць не знаю, як чалавек…” : [вершы] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1964. – 13 кастр.

74. **Ідуць** нашчадкі Ільіча : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1964. – 6 ліст. – С. 1.

75. **Мы прадаўжаем** рэвалюцыю : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1964. – 6 ліст.

76. **Радзіме.** У сэрцы жывіце маім. Роднае : [вершы] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1965. – 24 студз. – С. 1.

77. **Зімовае** : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1965. – 3 лют.

78. **“Мяне заўсёды** людзі радуюць…”. “Зімоваю ноччу позняю…”. “З яркага ранка…”. “Мы не баімся строгай споведзі…” : [вершы] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1965. – 21 лют. – С. 4.

79. **Высокі** поўдзень : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1965. – 6 сак.

80. **Нашчадкі** і равеснікі. Не шумі ты, рэчанька : [вершы] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1965. – 11 крас. – С. 4.

81. **Белыя** гусі мае : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1965. – 18 крас.

82. **Святкуе** наша Прыдняпроўе : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1965. – 1 мая.

83. **Майскі** вецер : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1965. – 23 мая.

84. **Новыя** вершы / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1965. – 20 чэрв. – Змест: Маці Феадосія Смалячкова. “О, памяць адчувальнейшая сэрца…”. “Я кожны дзень сябе знаходжу…”.

85. **“Я кожны** дзень сябе знаходжу…”. Чаканне. Будуць зноў заручаны… Родныя вуліцы. Белыя гусі мае… : [вершы] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1965. – 7 жн. – С. 1.

86. **Рабінавая** ноч. “Ва ўсім паэзія!..”. “І я шукаю словы…”. “І мы бываем часам жорсткія…”. Не шумі ты, рэчанька : [вершы] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1965. – 28 жн.

87. **Лірычны** верасень : [вершы] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1965. – 19 верас. – Змест: “Ад цябе чакаю я лістоў…”. “Ты толькі пакліч – і я цябе пачую…”.

88. **Верасень** : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1965. – 22 верас. – С. 4.

89. **“Яшчэ** адна восень паляцела ў вырай…”. “Паклічце да сябе, лясы…” : [вершы] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1965. – 25 верас.

90. **Родныя** вуліцы : [верш] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1965. – 26 верас. – С. 4.

91. **Маці** Феадосія Смалячкова. “Ад цябе я чакаю лістоў…” : [вершы] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1965. – 10 кастр. – С. 4.

92. **Пасля** дарог. “Мы не баімся строгай споведзі…” : [вершы] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1965. – 13 кастр.

93. **Апошні** лісток : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1965. – 31 кастр.

94. **Прысяга** Рэвалюцыі : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1965. – 6 ліст.

95. **Адлёт** журавоў : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1965. – 17 ліст.

96. **Ва ўсім** паэзія : [вершы] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1965. – 12 снеж. – С. 3. – Змест: “Ва ўсім паэзія!..”. “І я шукаю словы…”. “І мы бываем часам жорсткія…”. “Паклічце да сябе, лясы…”. “Перад табой трымаю споведзь…”. “О, памяць адчувальнейшая сэрца…”. “Адлёт журавоў”.

97. **Вершы** з кнігі “Зямная сімфонія” / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1965. – 25 снеж. – Змест: “Кропля ўпала – зямля скаланулася…”. “Перад табой трымаю споведзь…”. “Што ты шэпчаш, задуменны бор…”. “Ты – як песенька, ты – як сонейка…”. “Завея круціць, як бяздонны вір…”. “Я адчуваю водгукі зямлі…”. “Я лісце зялёнае кратаю…”.

98. **Маналог** вясны : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1965. – 2 сак.

1966 год

99. **“Вятры** зямныя хвалююць кантыненты…”. “Голлем гнуткім вятры зашасталі…” : [вершы] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1966. – 27 сак.

100. **Вернасць** : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1966. – 29 сак.

101. **Гучыць** твой гімн : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1966. – 1 мая.

102. **“Як і людзі**, паміраюць дрэвы…”. “Нам не забыць ваенныя гады…” : [вершы] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1966. – 5 чэрв.

103. **Я б глядзеў** на тваю прыгажосць…: [вершы] / А.М. Канапелька // Знамя юности. – 1966. – 28 июля. – С. 4. – Змест: “Нам не забыць ваенныя гады…”. “Кропля ўпала – зямля скаланулася…”. “Бярозкі страсаюць кроны…”.

104. **Ля крутых** берагоў…: [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1966. – 3 ліп.

105. **Ты такая** зямная…: [верш] / А.М. Канапелька // Знамя юности. – 1966. – 13 июля. – С. 4.

106. **Ты голасам** Шаляпіна пяеш : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1966. – 21 верас. – С. 4.

107. **Роднае.** “Любімая, не трэба сумаваць…” : [вершы] / А.М. Канапелька // Беларусь. – 1966. - № 10. – С. 4.

108. **На Смаленскай** дарозе. “Паміралі вы маладымі…” : [вершы] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1966. – 20 кастр. – С. 4.

109. **Гучыць** твой гімн : [верш] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1966. – 6 ліст. – С. 1.

110. **Лірыка** : [вершы] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1966. – 23 ліст. – Змест: “Колькі родных і блізкіх імён…”. “Міма сосен кашлатых…”.

111. **Лірыка** : [вершы] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1966. – 27 ліст. – Змест : “З красой першабытнай лясы…”. “З першым крыкам, з матчыным малаком…”.

112. **Чайкі,** чайкі : [вершы] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1966. – 18 снеж. – С. 4. – Змест: “Ля крутых берагоў мы стаім, як граніт…”. “Я тым не веру…”. “Закалыхаўся бор стары…”. “Я пазнаю сябе ў імгненні…”. “Як і людзі, паміраюць дрэвы…”.

113. **Вершы** : [вершы] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1966. – 23 снеж. – Змест: “Зямля любімая, з табою…”. Вераснёвы снег. “Я тым не веру, хто маўчыць за праўду…”. “Закалыхаўся бор стары…”. “Я пазнаю сябе ў імгненні…”.

1967 год

114. **Снежная** казка : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1967. – 1 студз.

115. **Снежная** казка. “Вось і зіма…”. “Памяць, як бурлівы акіян…”. “Заўсёды сумняваюся…” : [вершы] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1967. – 15 студз. – С. 3.

116. **Чалавек.** “Грукне галінкай…” : [вершы] / А.М. Канапелька // Звязда. – 1967. – 6 крас. – С. 4.

117. **Як міг** бліскавіцы. “Я думаю, трывожуся…”: [вершы] / А.М. Канапелька // Звязда. – 1967. – 5 снеж. – С. 4.

1968 год

118. **“А над зямлёй** такая ціш…” : [верш] / А.М. Канапелька // Магілеўская праўда. – 1968. – 18 крас.

119. **Ты шлях** свой пачынала з барыкад… : [верш] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1968. – 6 ліст. – С. 2.

1969 год

120. **Вершы** / А.М. Канапелька // Калінові мости. – Київ. – 1969. – С. 224-227.

121. **Ветразі** Балтыкі : [вершы] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1969. – 22 лют. – С. 4. – Змест: “Дык вось яна – Балтыка!..”. “На гарызонце ветразь…”. “Нідзе спакою не прашу…”. “Як дома, ўспыхнулі заранкі…”. “Трымціць паветра, як мембрана…”. “Яшчэ жыве адважны дух…”. “Маўчаць у восеньскай журбе…”.

122. **“Калі нараджаецца** песня…”. “Хоць сэрца не змяшчае боль…”. “Я – лодка. Плыву па рацэ…” : [вершы] / А.М. Канапелька // Беларусь. – 1969. - № 2. – С. 14.

123. **Сустрэча** з Ладагай. Я адчуваю дома. “Яшчэ далёка наш прывал…”. “Я адчуваю водгукі зямлі…” : [вершы] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1969. – 23 сак. – С. 3.

124. **Ідзе** красавік : [верш] / А.М. Канапелька // Настаўніцкая газета. – 1969. – 16 крас. – С. 4.

125. **“Самыя** добрыя песні…” : [верш] / А.М. Канапелька // Работніца і сялянка. – 1969. - № 7. – С. 22.

126. **Ты шлях** свой пачынала з барыкад : [верш] / А.М. Канапелька // Ленінская іскра. - Сянно, 1969. – 7 ліст. – С. 1.

1970 год

127. **“Трывожце**, дарогі і добрыя сны…” : [вершы] / А.М. Канапелька // Беларускі каляндар. – Беласток, 1970. – С. 144.

1971 год

128. **Новыя вершы** : [вершы са зборніка “Сустрэчы”] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1971. – 13 ліп. – С. 4.

1973 год

129. **Параўнаю** з дзівасілам : [верш] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1973. – 3 лют. – С. 3.

130. **Мінута** маўчання : [верш] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. - 1973. – 9 мая. – С. 2.

131. **Са Смаленскіх** дарог : [вершы] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1973. – 8 верас. – С. 3. – Змест: Сапшо. Аляксей Мішын. Ліст да дому. Роднае слова.

132. **Дзень** добры, лес! : [верш] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1973. – 15 верас. – С. 2.

133. **Ідуць** нашчадкі Ільіча : [верш] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. - 1973. – 13 ліст. – С. 4.

1974 год

134. **Крынічанька** Купалы. Круглае : [вершы] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1974. – 29 сак. – С. 3.

135. **Крынічанька** Купалы : [верш] / А.М. Канапелька // Знамя юности. – 1974. – 18 апр. – С. 4.

136. **Новыя** назвы : [верш] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1974. – 16 мая. – С. 3.

137. **Віцьбічы** : [верш] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1974. – 25 чэрв. – С. 3.

138. **Маці** Феадосія Смалячкова. “Як і людзі, паміраюць дрэвы…”. “З красой старажытнай, лясы…”. “Дамоў вяртаемся нячаста…” : [вершы] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1974. – 25 верас. – С. 3.

139. **Зімовае** : [вершы] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1975. – 4 студз. – С. 4. – Змест: “Снягі…Снягі…”. “Завеі круціць, як бяздонны вір…”. “Вось і зіма…”.

140. **Франтавыя** дарогі. Вуліца бацькі Міная. Вера. Дзяўчаты слухаюць вершы : [вершы] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1975. – 16 чэрв. – С. 3.

141. **Я – галасую** : [верш] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1975. – 16 чэрв. – С. 4.

1976 год

142. **Беларусі**. “…А касмадром – зямлі далонь…”. Мазурына. “Уваходжу ў лес…” : [вершы] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1976. – 13 жн. – С. 3.

1977 год

143. **Жаданне.** Дрэва. Жыццёвыя кругі : [вершы] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1977. – 12 ліст. – С. 4.

1978 год

144. **Нарач** : [верш] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1978. – 3 лют. – С. 4.

145. **Да людзей** спяшы. “Параненая птушка…” : [вершы] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1978. – 13 кастр. – С. 3.

1979 год

146. **Плошча** Перамогі. Выток. Вера. Памяць. Жаўранак. Спеўны дзень : [вершы з кнігі “Крынічны звон”] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1979. – 18 кастр. – С. 4.

1980 год

147. **Дзень** нараджэння : [верш] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1980. – 7 жн. – С. 4.

148. **Плошча** Перамогі. Выток : [вершы] / А.М. Канапелька // Літаратура і мастацтва. – 1980. – № 32 (8 жн). – С. 8-9.

1981 год

149. **Выток** : [верш прысвечан народнай артыстцы БССР З.І. Канапелька] / А.М. Канапелька // Чырвоная змена. – 1981. – 5 верас. – С. 4.

1982 год

150. **На Івана** Купалу : [верш] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1982. – 23 ліп. – С. 4.

151. **Радзіма** белая буслоў. Высачаны. Вераскі : [вершы] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1982. – 2 кастр. – С. 4.

1990 год

152. **Георгій** Скарына : [верш] / А.М. Канапелька // “Народу свайму ўслугуючы…” : творы беларускіх аўтараў, прысвечаныя Францішку Скарыне / уклад. М.Б. Яфімава. – Мн. : Рэспубліканскі навукова–метадычны цэнтр культуры., 1990. – С. 73-74.

153. **“Адкрываю,** як свет, нанова…” : [верш] / А.М. Канапелька // Каласы роднай мовы. – Мн. : Віцеб. дзярж. ун-т імя П.М. Машэрава, 1990. – С. 162.

1991 год

154. **“Я параўнаю** з дзівасілам…” : [верш] / А.М. Канапелька // Матчына слова : кніга пра беларускую мову / уклад. У. Паўлава ; прадмова Н. Гілевіча. – Мн. : Маст. літ., 1991. – С. 158-159.

1993 год

155. **“Я параўнаю** з дзівасілам…”. “Блакітны вецер…”. Трыпціх : [вершы] / А.М. Канапелька // Анталогія беларускай паэзіі : у 3 т. / рэдкал.: Р. Барадулін [і інш.] ; уклад. У. Гніламедаў. – Мн. : Маст. літ., 1993. - Т. 3 : Вершы і паэмы. – С. 299-301.

156. **Вершы /** А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1993. – 21 студз. – С. 3. – Змест: Памяці сябра. “Зусім цябе не дакараю…”. Святлане. “Я веру ў тое, што люблю…”. Крынкі. “Няспынны час…”. “Аблокі цёплыя плыні…”. “Завейны студзень, светлы і шумлівы…”. “Не трэба Чалавеку адзінота…”. “Жыве паэзія ў душы…”.

157. **У вечнасці** – ўзнясенне : [верш памяці сябра Мікалая Цішачкіна] / А.М. Канапелька // Віцебскі рабочы. – 1993. – 6 мая. – С. 6.

1995 год

158. **Хрыстос** прызямліўся ў Гародні : [верш, прысвечаны У. Караткевічу] / А.М. Канапелька // Народнае слова. – 1995. – 23 ліст. – С. 6.

1998 год

159. **Мова.** "Я параўнаю з дзівасілам…" : [вершы] / А.М. Канапелька // Сэрцам роднага слова краніся : хрэстаматыя для вучняў старэйшых класаў / уклад. М. Воінаў, К. Усовіч. – Мн. : Народная асвета, 1998. – С. 153-154.

160. **Плошча** Перамогі. Я размаўляю з вамі. Святлане. Васілю Быкаву. Хрыстос прызямліўся ў Гародні : [вершы] / А.М. Канапелька // Вечерний Витебск. – 1998. – 17 янв. – С. 4.

161. **Першы** званок : [верш] / А.М. Канапелька // Народнае слова. – 1998. – 1 верас. – С. 1.

162. **"Няспынны** час…". "Я да крынічкі чыстае прынік…". Хрыстос прызямліўся ў Гародні. Радзіма белая буслоў. "Ты кажаш, бору не баліць…". "Трывогу ў сэрцы разумею…" : [вершы] / А.М. Канапелька // Полымя. – 1998. - № 12. – С. 44-47.

1999 год

163. **На Івана** Купалу : [верш] / А.М. Канапелька // Свой пачэсны пасад : кн. пра Я. Купалу / уклад. С. Панізьнік. – Мн. : Маст. літ., 1999. – С. 74.

164. **"Народжаны я** ў Беларусі…" : [нізка вершаў] / А.М. Канапелька // Народнае слова. – 1999. – 24 ліп. – С. 6.

165. **"Не хавайце** сваіх усмешак…" : [верш] / А.М. Канапелька // Народнае слова. – 1999. – 28 кастр. – С. 8.

166. **Крылатая** восень па дарозе ў вырай : [вершы] / А.М. Канапелька // Народнае слова. – 1999. – 16 ліст. – С. 5. – Змест: "Я кожны дзень сябе знаходжу…". "Зусім нечакана верасы расцвілі…". "Я слова роднае лаўлю…". "У нас не любяць сейбітаў і творцаў…". "У краі, дзе маленства след…". "Наша вёска невялічка…". "Яшчэ адна восень…".

167. **"Я слова** роднае лаўлю…" : [вершы] / А.М. Канапелька // Літаратура і мастацтва. – 1999. – 26 ліст. – С. 13. – Змест: "У красе красавіцкай…". Такі ўжо лёс. "Я з табой…". Расоншчына – радзінная радзіма. "Ён сейбіт быў, садоўнік адмысловы…". "Я слова роднае лаўлю…". "Я – крывіч…".

2000 год

168. **"Плача** над берагам чаіца…". "Я веру ў тое, што люблю…" : [вершы] / А.М. Канапелька // Дзвіна. Віцебшчына літаратурная : альманах / уклад. Л. Крэскіян, Ф. Сіўко; рэд. А. Салтук. – Віцебск : Віцеб. абл. друк., 2000. – Вып. 3. – С. 42.

169. **Віцьбічы** [верш] / А.М. Канапелька // Квітней, мой горад над Дзвіною! : [вершы і песні пра Віцебск] / уклад. Л.М. Амбразевіч. – Віцебск, 2000. – С. 17.

170. **Хрыстос** прызямліўся ў Гародні : [верш] / А.М. Канапелька // Народнае слова. – 2000. – 25 ліст. – С. 5.

2002 год

171. **На Івана** Купалу. Крынічанька Купалы ў Ляўках : [вершы] / А.М. Канапелька // Бацькаўшчына : зб. гіст. літ. / уклад. С.С. Панізнік. – Мн. : Маст. літ., 2002. – С. 187-188.

2003 год

172. **Хрыстос** прызямліўся ў Гародні : [верш] / А.М. Канапелька // Народнае слова. – 2003. – 4 студз. – С. 5.

173. **Вершы** : [са зборніка "Музыка лістапада"] / А.М. Канапелька // Віцьбічы. – 2003. – 23 студз. – С. 15. – Змест: "Аблокі цёплыя плылі…". "Трывогу ў сэрцы разумею…". "Я ў слове адчуваю цішыню…". "Маёй любові снежны зарапад…". "Завея круціць…".

174. **"Я слова** роднае лаўлю…" : [верш] / А.М. Канапелька // Белорусская нива. – 2003. – 6 сент. – С. 1.

2005 год

175. **Вершы** / А.М. Канапелька // Дзвіна. Віцебшчына літаратурная : альманах / уклад. і рэд. Ф. Сіўко. – Віцебск : Віцеб. абл. друк., 2005. – Вып. 4. – С. 34-36. – Змест: "Я веру ў тое, што люблю…". "Няспынны час…". "Смяецца чалавек, смяецца…". "Я слова роднае лаўлю…". "Не хавайце сваіх усмешак…". "Мы – прарокі ў сваёй Айчыне…". "Маёй любові снежны зарапад…".

2009 год

176. **Васілю** Быкаву : [верш] / А.М. Канапелька // Пасланец мужнасці : паэтычныя прысвячэнні Васілю Быкаву / уклад. Ю. Голуб. – Мінск : Кнігазбор, 2009. – С. 39.

ПЕРАКЛАДЫ

177. **Бажылаў, В.** Багаты : [верш] / В. Бажылаў ; пер. з балгар. А. Канапелькі // Магілеўская праўда. – 1962. – 21 верас.

178. **Тауфер, І.** Люблю : [верш] / Іржы Тауфер ; пер. з чэшскай А. Канапелькі // Магілеўская праўда. – 1962. – 14 ліст.

179. **Палітыка, А.** Ля плёсаў дняпроўскіх : [верш] / Апанас Палітыка ; пер. з рус. А. Канапелькі // Чырвоная змена. – 1963. – 17 крас. – С. 3.

180. **Рыбачкін, А.** У Хінганскай цясніне. Я не здзіўляюся зусім : [вершы] / А. Рыбачкін ; пер. з рус. С. Марчанкі, А. Канапелькі // Магілеўская праўда. – 1963. – 7 чэрв.

181. **Сангі, В.** Мы выйшлі ў мора : [верш] / В. Сангі ; пер. з ніўхскага А. Канапелькі // Магілеўская праўда. – 1963. – 7 чэрв.

182. **Гараі, Г.** Уверцюра : [верш] / Габор Гараі ; пер. з венгер. А. Канапелькі // Магілеўская праўда. – 1963. – 18 кастр.

183. **Мацянка, М.** Ля брацкай магілы. Асенняе. Табе : [вершы] / Міхась Мацянка ; пер. з рус. А. Канапелькі, А. Пысіна // Чырвоная змена. – 1964. – 14 кастр. – С. 4.

184. **Ісаеў, М.** Гайдуцкая магіла : [верш] / Младэн Ісаеў ; пер. з балгар. А. Канапелькі // Магілеўская праўда. – 1965. – 12 верас.

185. **Стэфанава, Л.** “Гарыць і ў нас акно сярод шматлікіх вокан…” : [верш] / Ліліяна Стэфанава ; пер. з балгар. А. Канапелькі // Магілеўская праўда. – 1965. – 12 верас.

